# РЭДКІЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ “ГРАЖЫНЫ”: А. МІЦКЕВІЧ І ШЧОРСЫ

***Раманюк Кацярына, Рэспубліка Беларусь***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Рэспубліка Беларусь, г.Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Носік А.А.*

*Анатацыя.* Артыкул закранае малавядомыя старонкі з жыцця і творчасці Адама Міцкевіча, раскрывае ролю парка і бібліятэкі Храптовічаў у станаўленні асобы пісьменніка і напісанні паэмы “Гражына”.

*Ключавыя словы: Міцкевіч, Шчорсы, “Гражына”.*

Легендарная асоба, вядомы палітычны дзеяч і канцлер Вялікага Княства Літоўскага Іахім Літавор Храптовіч  (1729 – 1812 гг.) – адукаваны чалавек, ён разумеў, што трэба ў сваім жыцці рабіць не толькі для сябе самога, але і для людзей, сваёй зямлі і краіны.  Ён меў добрую адукацыю. Вучыўся ў Вільні, Германіі. Наведваў Італію, Аўстрыю, Швейцарыю, Францыю, Англію. Грунтоўна парупіўся ён аб сваім маёнтку ў Шчорсах. Калі драўляныя будынкі фальварка і сціплы палац сядзібы ўжо не маглі адпавядаць ролі адміністрацыйна-гаспадарчага цэнтра багатага маёнтка, Іахім Храптовіч задумаў узвесці непадобны да іншых архітэктурны ансамбль у барочным стылі. На захад ад палацавага комплексу знаходзіўся пейзажны парк плошчай каля 40 гектараў. Сярод дрэў, якія былі пасаджаны ў парку Храптовіча, быў і звычайны летні чарэшчаты дуб. Невядома дакладна, ці верыў у гэтыя прымхліцы наш зямляк, вялікі паэт Адам Міцкевіч, аднак ён любіў і адпачываць, і працаваць пад дубамі. Дастаткова прыгадаць  “Дубы Адама Міцкевіча” ў вёсках Варонча Карэліцкага раёна, Бабры Лідскага раёна на Гродзеншчыне, у Кажан-Гарадку Лунінецкага раёна, што на Брэстчыне, і, вядома ж, шчорсаўскі “Дуб Міцкевіча”.

На паўночны захад ад палаца на беразе самай вялікай сажалкі быў пастаўлены Т-падобны ў плане двухпавярховы будынак, прызначаны для славутай бібліятэкі І. Храптовіча (першапачаткова бібліятэка месцілася на другім паверсе палаца, але неўзабаве яе фонд стаў настолькі вялікі, што спатрэбілася асобнае памяшканне). Бібліятэка, якая збіралася Іахімам Храптовічам і яго сынам Адамам на працягу другой паловы XVIII і першай паловы XIX стагоддзяў змяшчала каля 15 тысяч (па іншых звестках – звыш 20 тысяч) кніг на розных мовах (старажытныя рукапісы, геаграфічныя карты, каштоўны архіў) і стала значнай культурнай з’явай. Таму і не дзіўна, што такі багаты збор ў Шчорсах прыцягваў да сябе вядомых людзей, вучоных, грамадскіх дзеячаў.  З цягам часу бібліятэка стала фактычна публічнай. Адам Храптовіч адкрыў доступ да сваёй багатай бібліятэкі і архіва не толькі вучоным, але і студэнтам, аматарам кнігі. З унікальнай літаратурай і рукапісамі ў розны час тут працавалі славуты гісторык,  прафесар Віленскага

і Варшаўскага ўніверсітэтаў Іахім Ляляевель, перакладчык, літаратурны крытык і краязнаўца Уладзіслаў Сыракомля, астраном Марцін Пачобут-Адляніцкі, вядомы пісьменнік і фальклардыст, ураджэнец Шчорсаў Антон Глінскі, а таксама маладыя віленскія студэнты- філаматы, мэтай якіх была культурна-асветніцкая дзейнасць: Ян Чачот, Тамаш Зан, Францішак Малеўскі, які з фінансавай падтрымкай Адама Храптовіча арганізаваў ланкастарскую школу для сялян у Шчорсах [1].

Некалькі разоў (ужо пасля смерці Іахіма  Храптовіча) у Шчорсах бываў юны паэт Адам Міцкевіч. Першы раз гэта было ўвосень 1819 года, з нагоды чаго Ян Чачот піша верш “На прыезд Адама Міцкевіча”, які, дарэчы, з таго часу пачаў настаўнічаць у Коўне [2].

Паводле падання мясцовай жыхаркі Каляда Людмілы Аляксандраўны і былой настаўніца гісторыі Паддубіцкай Марыі Пятроўны, у маёнтку Шчорсы, пад разгалістымі шатамі вялікага дуба, каля якога давалі клятву філаматы, Адам любіў пабыць у адзіноце пасля працы ў бібліятэцы Храптовічаў. Пад гэтым дубам, як сведчыць паданне,  паэт стварыў накіды сваёй цудоўнай паэмы “Гражына”, у аснову якой паклаў легенду пра возера Літоўка, што знаходзіцца на поўнач ад яго роднага Навагрудка.  Таму гэтае дрэва ў народзе пачалі называць  “Дубам Міцкевіча”, або “Дубам Гражыны”.

У “Заўвагах” да “Гражыны” Міцкевіч спасылаецца на дзясятак кніг, з якімі пазнаёміўся ў Шчорсаўскай бібліятэцы. І, відаць, не выпадкова, а ў памяць пра заснавальніка Шчорсаўскай бібліятэкі, Міцкевіч даў галоўнаму герою, наваградскаму князю і мужу Гражыны рэдкае старажытнае імя Літавор.

Другі раз Міцкевіч прыязджае ў Шчорсаўскую бібліятэку летам 1821 года (у жніўні тут Адам піша санет “Да Нёмана”) [3]. Трэці раз Міцкевіч наведаў Шчорсы ў  снежні 1821 – студзені 1922 года. У бібліятэцы Храптовічаў паэт збіраў матэрыял да паэмы “Конрад Валенрод”, і ў любую пару года Міцкевіч заўсёды ішоў “у госці” да свайго дуба, які даваў яму творчую актыўнасць.

Восенню 1915-га,  на Уздзвіжанне,  на нашу зямлю прыйшлі чужынцы – ваякі германскага кайзера Вільгельма.  Праходзіла лінія фронту па рацэ Нёман, за якой былі рускія войскі. У Шчорсах – пазіцыі немцаў. У выніку неаднаразовых артылерыйскіх абстрэлаў палац Храптовічаў быў моцна пашкоджаны, як, дарэчы, і мясцовая царква. Цэлым застаўся будынак бібліятэкі, адкуль яшчэ перад пачаткам вайны гаспадары вывезлі ў Кіеўскі ўніверсітэт і перадалі на дэпазіт асноўную частку свайго багатага кнігазбору. Стаяў непашкоджаным і Міцкевічаў дуб. Стаяў і глядзеў, як зямля, якая больш-менш карміла мясцовы люд, цяпер знявечана  акопамі і варонкамі ад снарадаў, абцягнута калючым дротам і напоена чалавечай крывёю…

Пацярпелі пабудовы Храптовічаў і ў час грамадзянскай вайны. Пры савецкай уладзе ўся маёмасць Храптовічаў была нацыяналізавана, каштоўная калекцыя старажытнасцей і твораў мастацтва вывезена ў Маскву, архіў – у Пецярбург. Слава Шчорсаў ліхаманкава пачала знікаць [4].

Пасля Другой сусветнай вайны маёнтак Шчорсы стаў часткай мясцовага калгаса. Асноўныя збудаванні комплексу прыйшлі ў канчатковы заняпад, парк, запушчаны і забалочаны, набыў рысы лесапаркавай зоны. У 1950-х гадах палац зруйнаваны да падмуркаў. Да кары славутага дуба была прыбіта невялікая таблічка, што тут працаваў над паэмай “Гражына” Адам Міцкевіч.

У 1998 годзе у час моцнай буры ў славутае дрэва ўдарыла маланка і яно загінула. Не стала яшчэ аднаго знакавага для Беларусі дрэва – дуба Міцкевіча ў Шчорсах, які крыху не дажыў да 200-годдзя Адама.

У пачатку чэрвеня 2013 года па ініцыятыве мясцовых энтузіястаў на месцы былога дуба Міцкевіча быў пасаджаны малады дубок, які, на жаль, не прыжыўся [5]. Затое вакол пня, што застаўся ад колішняга волата, паўкругам растуць і ахоўваюць яго спакой аж пяць ягоных “сынкоў”.

Такім чынам, хоць ад славутага дуба сёння мала што засталося, варта захаваць для будучых пакаленняў рэшткі шчорсаўскага “Дуба Міцкевіча”, зрабіць пастамент і побач размясціць летапісныя звесткі і фота “Дуба Міцкевіча” розных часоў, каб жыла памяць пра гэты помнік прыроды і мясціну, дзе нарадзілася славутая “Гражына”.

Літаратура:

1. Францішак Геранім Малеўскі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Францішак_Геранім_Малеўскі. – Дата доступу: 17.09.2024.

2. Чачот, Я. На прыезд Адама Міцкевіча / Я. Чачот [Электронны рэсурс] Рэжым доступу: https://knihi.com/Jan_Cacot/Na_pryjezd_Adama_Mickievica.html. – Дата доступу: 14.09.2024.

3. Міцкевіч, А. Да Нёмана [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Adam_Mickievic/Da_Niomana_6.html. – Дата доступу: 16.09.2024.

4. Кавальчук, Г. Палацава-паркавы комплекс Храптовічаў у Шчорсах [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://novgazeta.by/news/nashi-proekty/vyartanne-praz-stagoddzi-palatsava- parkavy-kompleks-khraptovicha-u-shchorsakh/. – Дата доступу: 16.09.2024.

5. Дуб. 11 самых настоящих реликвий [Электронны рэсурс]. – СБ, 14.07.2013. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/legendy-sled-na-dube-tom.html. – Дата доступу: 18.09.2024.